# Грыбы і мысьлі

## З лесу.

1. Грыбы ў лесе да ня ў лесе. Трэба іх найсьці. Знайшоўшы іх, чалавек выбірае лепшае з іх. Перш чым знайсьці, чалавек праходзіць шмат дарогі і дарэмна, г. зн. не знаходзячы. Для знахадкі патрэбна затрата. Твае грыбы ў лесе, пайдзі і забяры іх. Дома грыбы перабіраюць, сартуюць, вараць, смажаць, сушаць, соляць, квасяць, марынуюць — словам, перарабляюць і спажываюць.

2. Ахварбоўка грыба, як іншых расьлін, залежыць ад дзейнасьці сьвятла на яго. Вось чаму і грыб і набывае ахварбоўку пад колер свайго асяродзьдзя, бо і гэта асяродзьдзе знаходзіцца пад уплывам тых–жа, што і грыб, прычын. Т[акім] ч[ынам], гутаркі пра прыстасоўваньне да *вакольнага* асяродзьдзя недакладна выяўляюць працэсы, што адбываюцца ў абсягу ахварбоўкі. Паверхня кожнай расьліны — што фотаграфічная пласьцінка.

3. Чым абумоўліваюцца формы (і іх разнастайнасьць) існага ў прыродзе? Чаму тое, што вядома чалавеку як грыб, расьце ў форме грыба, дрэва — форме дрэва, расьліна кожнае ў сваёй форме?

4. Рост расьліны падобен каталізацыі. Тое, што з зямлі, хэмічна злучаецца з тым, што з паветра, пры дапамозе каталізатара, якім ёсьць зерне, зародак. (Пра іст[оту] зар[одку] зьвяр[нуцца] да эмбрыялёгіі.) Але рост адбываецца да пэўнай граніцы, у пэўных межах як у часе, так і прасторы. Ці не абумоўліваю[цца] гэтыя граніцы зьместам (мецьцем) тых элемэнтаў, якія здольны каталізавацца ў ёй? і дзейнасьцю самога каталізатара? яго здольнасьцю ў часе?

5. Ці не з[ь]яўляецца рост расьліны з зярняці, з зародку падобным разлажэньню атама? Як атам раскладаны дае вялізарную колькасьць энэргіі, так і зародак дае расьліну? (Давед[ацца] у эмбрыолёгаў.)

6. Форму ў зародку можна разглядаць як захаваную („зьвітую“, якая ў росьце „разьвіваецца“). Прынамсі, у зародку ўжо ёсьць тое, што абумоўлівае данную форму.

7. Рост — гэта колькаснае памнажэньне. Разьвіцьцё — памнажэньне якаснае. Рост — у асобе. Разьвіцьцё — у родзе.

8. „Разьвіцьцё“ прадумоўлівае процілеглы працэс — „зьвіцьцё“.

---

Мудрасьць у жыцьці. Яе трэба толькі выбраць з жыцьцёвай звычайнасьці. Мудрасьць — гэта выбранае ў жыцьці. Яе трэба ўсьвядоміць.

---

Розум можна разглядаць як існае ў жыцьці. Трэба толькі яго зрабіць прадметам мысьлі, яго ўсьвядоміць.

*[1932 — 1933]*